# АСІПОВІЧЫ – ТВАР БЕЛАРУСКАЙ ПРАВІНЦЫІ

*даведнік*



*Мы, асіпаўчане, безумоўна, любім свой Асіповіцкі раён любоўю асаблівай. Гэты невялікі раён, які знаходзіцца амаль у самым цэнтры Беларусі. Наш край пакрыты дзівоснымі па прыгажосці лясамі, квітнеючымі палямі, ён зіхаціць бліскучымі люстэркамі рэк і азёр. Гэта раён, які памятае і паважае свае традыцыі, культуру, а таму вельмі беражліва і ўважліва ставіцца і даглядае за шматлікімі помнікамі гісторыі.*

*Але наш раён вечна маладзее і таму заўсёды адкрыты для ўсяго новага. Прыязджайце, і вы таксама палюбіце Асіповічы!*

*Калі цікавіцеся гісторыяй, культурай, мастацтвам, спортам, здаровым ладам жыцця, прыязджайце ў Асіповічы!*

*Калі любіце падарожнічаць па далінах-палям, па лясах-пагорках, на лоне дзікай прыроды, цешыцца дзіўнымі краявідамі, прыязджайце ў Асіповічы!*

*Асіповіцкае вадасховішча, біялагічныя заказнікі, помнікі прыроды пакінуць незабыўныя ўражанні на вельмі і вельмі доўга…*

*Калі вам па сэрцы жыццё гарадоў, – таксама прыязджайце ў Асіповічы, хаця мітусні мегаполісаў вы тут і не знойдзеце! Але ўсе ж вы пабачыце развітую вытворчую і сацыяльную інфраструктуру.*

*Калі хочаце адпачыць, пабалаваць сябе сувяззю з прыродай, прыязджайце ў Асіповічы! Нашы базы адпачынку, санаторыі, аграсядзібы славяцца гасціннасцю, якасцю абслугоўвання і цеплынёй адносін…*

*Калі любіце смачна паесці, прыязджайце ў Асіповічы! Вы не толькі паспрабуеце мноства нацыянальных страў, але і зможаце пакаштаваць усё, што пажадаеце са страў болей звыклай для вас кухні…*

***Прыязджайце ў Асіповічы! Тут вас заўсёды чакаюць цяпло, утульнасць, памяркоўнасць і добры настрой!***

# Асіповіцкі стары горад

*Старадаўнія вуліцы суседнічаюць з новабудоўлямі.* Лінія чыгункі падзяляе Асіповічы на дзве часткі: паўночна-усходнюю і паўднёва-заходнюю. Усё будаўніцтва горада (раней мястэчка) вялося ўздоўж чыгункі. Так і сфарміраваўся раён старога горада.

*Самыя разнастайныя архітэктурныя стылі.* У ансамблях асіповіцкіх цэркваў, касцёлаў і дамоў адбіваюцца стылі: позні класіцызм, класіцызм, неакласіцызм, канструктывізм, імперскі стыль Германіі, «сталінскі ампір» у СССР. У «старых» Асіповічах 1 снежня 2006 года адкрылася персанальная карцінная галерэя народнага мастака Беларусі У. І. Стальмашонка. Працуе адна з найстарэйшых праваслаўных цэркваў раёна – Крыжа-Узвіжанская, пабудаваная ў 1826 годзе з дрэва на сродкі памешчыкаў Шышко ў цэнтры воласці – вёсцы Замошшы. Па архітэктуры царква – тыпавая пабудова псеўдарускага стылю. У 1949 годзе перанесена ў Асіповічы і была асвечана. Для ўсіх гасцей Асіповіч шырока расчынены дзверы гісторыка-краязнаўчага музея. Гістарычныя экспазіцыі, сучасныя выставы не пакінуць вас раўнадушнымі.

*Самыя чытаючыя жыхары раёна.* На адной з найстарэйшых вуліц горада – Кастрычніцкай – знаходзіцца цэнтральная раённая бібліятэка, якая вядзе сваю гісторыю з лета 1919 года. Доўгі час бібліятэка размяшчалася ў памяшканні яўрэйскай сінагогі (раней гэта вуліца была чыста яўрэйскім кварталам). Па рашэнні райвыканкама пад будаўніцтва новага будынка бібліятэкі быў выдзелены зямельны ўчастак, куплены і перавезены дом, і ў 1953 годзе бібліятэка пераехала ў новы будынак, дзе і зараз знаходзіцца.

*Утульна і вельмі блізка.* У Асіповічах ёсць утульныя маленькія кафэ, рэстараны, маленькія і велічныя магазіны. Вуліцы і вулачкі хаваюць у сабе шмат нязведанага: разныя аканіцы, векавая пабудова, шыкоўныя кветкі ў вакне і ў агародчыку… Тут вельмі прыемна праводзіць час. Усё так блізка і так хораша! Не забудзьцеся наведаць гарадскі рынак і прывезці падарункі сваім родным і блізкім!

**Утульныя вулачкі і завулкі, прыемныя рэстаранчыкі і кафэ, усё так блізка і так хораша! Вы будзеце зачараваныя Асіповічамі!**

# Незабыўная паўнаводная Свіслач

*Сталічная рака.* Асіповіцкі раён прасякнуты блакітнымі венамі рэк. Рака Свіслач нясе свае воды па многіх раёнах Беларусі, у тым ліку ў сталіцы – Мінску. Раней яна была суднаходнай артэрыяй, па якой сплаўлялі лес. У яе водах вадзілася шмат рыбы. Нашы маленькія рачулкі Сіняя, Граўка, Лапка, Трубінка, Целянка, Ботча, Жыцінка напаўняюць Свіслач сваімі водамі. А ў вёсцы Свіслач ля руінаў старадаўняга замка Свіслач зліваецца з Бярэзінай. І гэты малюнак пакідае незабыўнае ўражанне ва ўсіх прыезджых. Ахоплівае пачуццё, што галасы прыгожых рэк зліліся ў непаўторную, цудоўную мелодыю. Свіслач зачароўвае сваім спакоем.

*Асіповіцкае вадасховішча і гідраэлектрастанцыя.* Галоўная асаблівасць Асіповіцкага раёна – шырокае вадасховішча (1307,7 га), створанае на р. Свіслач у 1953 годзе для будаўніцтва гідраэлектрастанцыі. Гідразбудаванне вельмі добра ўпісваецца ў ландшафт штучна створанага вадасховішча, акружанага крутымі схіламі берагоў, укрытых маляўнічымі лясными масівамі. Яго водныя прасторы, напоўненыя чароўнымі краявідамі, найчысцейшым паветрам, даўно сталі аблюбаваным месцам для заняткаў воднымі відамі спорту, зімовай і летняй рыбалкай. Азартных рыбакоў парадуе багацце вадаёма сомам, ляшчом, акунём, плоткай, шчупаком, карасём і карпам.

*Смачная рыбка.* Прыехаўшы ў Асіповічы, абавязкова паспрабуйце рыбу! Недалёка ад вёскі Вяззе размешчана 9 стаўкоў рыбгаса «Свіслач», дзе арганізуецца платная рыбалка. На стаўках рыбнай гаспадаркі разводзіцца і гадуецца карп, белы амур, таўсталобік, карась, шчупак, асетр. Фірменная страва рыбгаса – вэнджаная і вяленая рыба, рыбныя кансервы. Пераканайцеся – гэта вельмі смачна!

***Цешцеся спакоем ракі, шумам турбін ГЭС і смакам рыбных страў!***

# Унікальныя традыцыі і аўтэнтычнасць

*Унікальныя музычныя і танцавальныя традыцыі.* У нашым раёне на працягу ўсяго года праводзіцца мноства традыцыйных свят: Купалле, Калядныя гулянні, Масленіца. З 1992 года ідзе па Асіповіцкім раёне раённы фестываль фальклору «Ліпеньскія шчадроўкі». На свята з’язджаюцца многія калектывы мастацкай самадзейнасці. На гэтым шматлюдным свяце сумаваць некалі: песні, танцы, калядныя забавы, хаджэнні, пераадзетыя па дамах з пажаданнем дабра і дабрабыту. Тут весяла і цікава заўсёды!

*Рэальны дотык да аўтэнтычнасці.* Вам даводзілася стаць удзельнікамі аўтэнтычнага свята і на ўласным вопыце даведацца як жылі ў даўніну? Загляніце ў Вяззеўскі Дом культуры! Тут пакажуць, як у былыя часы ў раёне праходзілі вяселлі, запросяць паўдзельнічаць у абрадзе «Вяселле Цярэшкі», падораць на памяць «Мяшэчак шчасця»!

*Сувязь часоў.* Болей 100 аўтэнтычных узораў беларускіх народных песень, якія бытуюць у вёсках Асіповіцкага і суседняга Клічаўскага раёнаў, запісана ўдзельнікамі народнага ансамбля беларускай песні «Вязанка» Вяззеўскага Дома культуры. Аснову рэпертуару складаюць творы на 3-4 галасы з элементамі харэаграфіі, народныя абрады «Радзіны», «Заручыны», тэатралізаваныя народна-святочныя прадстаўленні «Каляды», «Гуканне вясны», «Сёмуха», «Купалле», «Зажынкі». Калектыў удзельнічаў у Міжнародным фестывалі славянскай культуры «Хотмыжская восень» (Белгарад).

***Адкрыйце для сябе сэнс і прывабнасць унікальных народных традыцый!***

# Мемарыяльныя комплексы, манументы, помнікі гісторыі

*Памяць у сэрцах і граніце.* Ні адзін з куткоў Беларусі немагчыма прадставіць без помнікаў гісторыі і культуры – своеасаблівага летапісу жыцця народа, яркіх сведак яго працоўнай, рэвалюцыйнай і баявой славы. Шмат іх і на тэрыторыі Асіповіцкага раёна.

*У гонар заснавання Асіповіч.* Горад Асіповічы ўзнік дзякуючы чыгунцы. Адкрыццё ў 1873 годзе побач з аднайменнай вёскай невялікай станцыі з вадакачкай, вакзалам і паравозным дэпо стала вялікай падзеяй. І таму асіпаўчане беражліва захоўваюць памяць пра тыя далёкія падзеі. Рух цягнікоў ад Мінска да Бабруйска адкрыўся 16 верасня 1873 года. Першаму паравозу ў Асіповічах пастаўлены помнік. Здаецца, ён прама зараз падасць сігнал і адправіцца ў дарогу!

*Вечная слава героям.* Ёсць у Асіповічах надзвычайнае месца, створанае рукамі мясцовых патрыётаў, воінаў-інтэрнацыяналістаў. Да 125-годдзя горада Асіповічы ў гарадскім парку вырас велічны мемарыяльны комплекс «Алея герояў». Памятныя знакі з імёнамі і партрэтамі Герояў Савецкага Саюза, тры стэлы, якія ўзняліся ўвышыню, мора колераў! Пастойце, успомніце, памаўчыце!

***Пераканайцеся ў тым, што ў невялікім горадзе знойдзецца куток славы і не адзін.***

# Прыгожая натуральная прырода

*Экалагічныя дары прыроды.* Асіповіцкія лясы багатыя грыбамі і ягадамі: суніцы, чарніцы, маліна і журавіны – чароўны смак і сапраўдны лясны водар! Лоўля рыбы ў рацэ або возеры — цікавае і, галоўнае, карыснае баўленне часу! На тэрыторыі Градзянскага лясніцтва знаходзіцца адзінае ў Асіповіцкім раёне возера прыроднага паходжання, узрост якога вылічаецца дзесяткамі тысячагоддзяў. Гэта Лочынскае возера. Асаблівая раскоша тут бабрам і андатрам. Пасля таго, як асушылі балота, менавіта каля Лочынскага азёра знайшлі сабе прытулак ласі.

*Разнастайныя забавы!* Адпачываць на асіповіцкіх азёрах і рэках, купацца, плаваць на байдарках, плытах – усе забавы нават пералічыць цяжка! У Асіповіцкім раёне ёсць рад біялагічных і гідралагічных заказнікаў і помнікаў прыроды мясцовага значэння. Сярод іх: комплекс батанічных прыродаахоўных аб’ектаў – помнік прыроды «Жорнаўскі дэндрасад» і заказнік «Дуброва», якія прыгодныя для правядзення абучаючых, пазнавальных і навуковых экскурсій, пракладкі экскурсійных маршрутаў у сілу высокай ступені прыстасаванасці для наведвання іх людзьмі. На тэрыторыі ДДЛГУ «Асіповіцкі вопытны лясгас» арганізаваны 6 аб’ектаў прыродных тэрыторый, якія ахоўваюцца: Помнік прыроды «Прыцерпа», Батанічны помнік прыроды мясцовага значэння «Эталоннае насаджэнне», Заказнікі мясцовага значэння «Сеціца», «Ляжанка», і два батанічных помніка прыроды рэспубліканскага значэння «Дуб-волат» і «Дуб-гігант». Нягледзячы на строгія правілы бяспекі і паводзін наведвальнікаў, вы зможаце ў поўнай меры нацешыцца натуральнай прыгажосцю прыроды.

*Усяго шмат!* Натуральная, прыгожая прырода – вялікая каштоўнасць Асіповіцкага раёна!

***Выпрабуй радасныя імгненні ў самым сэрцы непаўторнай прыроды!***

# Найбуйнейшы чыгуначны вузел

*Гартаючы старонкі гісторыі.* Датай утварэння горада Асіповічы лічыцца 17 лістапада 1872 года, калі тут, у глушы Мінскай губерні, сярод лясоў і балот, была пабудавана станцыя Лібава-Роменскай чыгункі з пяццю драўлянымі дамамі для абслугоўваючага персаналу. Сваю назву яна атрымала ад размешчанай у двух кіламетрах вёскі Асіповічы.

*Станцыя Асіповічы* ўваходзіць у склад Транспартнага Рэспубліканскага Унітарнага прадпрыемства «Магілёўскае аддзяленне Беларускай чыгункі» як чыгуначны вузел, які ўтвараецца перасячэннем напрамкаў Мінск–Гомель, Магілёў–Слуцк–Калій і ўчастка Асіповічы–Градзянка. Праз Асіповічы імчацца цягнікі ў Маскву і Санкт-Пецярбург, Адлер, Марыупаль, Сімферопаль і г.д. У склад аб’яднанай станцыі ўваходзяць дзевяць прамежкавых станцый, якія ўзаемадзейнічаюць паміж сабой. Акрамя таго, у склад станцыі Асіповічы ўваходзіць вакзал, прызначаны для абслугоўвання пасажыраў, прыёму, адпраўлення багажу і грузабагажу. Падыходы да станцыі Асіповічы-1 абсталяваны мастамі і пуцеправодамі ў двух узроўнях. Асноўны напрамак Гомель–Бабруйск–Асіповічы–Мінск электрыфікавана. Асіповічы па прызначэнні і характары эксплуатацыйнай работы з’яўляецца ўчастковай станцыяй. У залежнасці ад аб’ёму аперацый, якія выконваюцца з пасажырскімі і грузавымі цягнікамі і вагонамі, складанасці работы, станцыя Асіповічы аднесена да пазакласных станцый. Каля 10 прадпрыемстваў па абслугоўванню чыгункі (лакаматыўнае дэпо, вагоннае дэпо, дыстанцыя сігналізацыі і сувязі і інш.) зробяць усе магчымае, каб ваша падарожжа прайшло выдатна. Станцыя прызначана для расфарміравання і фарміравання грузавых цягнікоў, выканання вытворчых аперацый па абслугоўванні грузавых цягнікоў і вагонаў, падрыхтоўкі грузавых вагонаў пад пагрузку, грузавых аперацый з вагонамі, фарміравання і абслугоўвання пасажырскіх цягнікоў.

Станцыя Асіповічы выконвае значны аб’ём работы па перапрацоўцы розных катэгорый вагонапатокаў на Беларускай чыгунцы. Гэта звязана з яе распалажэннем на перасячэнні двух найбольш важных напрамкаў сеткі Беларускай чыгункі.

***Адчуй веліч і магутнасць чалавечай працы***

# Унікальны адпачынак у аграсядзібах

*Высокаякасныя паслугі.* У Асіповіцкім раёне вы знойдзеце вялікую колькасць аб’ектаў вясковага турызму – аграсядзіб. Іх дзверы заўсёды адкрыты – уладкоўвайцеся і адпачывайце на свежым паветры. Жыць у вясковай сядзібе на свежым паветры, цешыцца спакоем лесу, а можа, забаўляцца? Усё магчыма! Адчуйце сябе дзецьмі прыроды, адпачніце ад шуму вялікага горада ў абдымках натуральнай прыроды!

*Незабыўны і прыемны адпачынак.* Сардэчна адчыняць перад вамі дзверы аграсядзібы, дамы рыбака і паляўнічага, базы адпачынку. Усе яны размешчаны ў маляўнічых месцах, ля рэк і азёр. У дамах маецца ўсе неабходнае для камфорту: душ, туалет, халадзільнік, газавая пліта з духавой шафай, мікрахвалевая печ, электрачайнік, сталовы посуд і прыборы, а таксама кабельнае тэлебачанне, DVD, інтэрнэт. На ўчастках расце мноства розных шматгадовых і аднагадовых кветак, што стварае ўражанне наведвання Батанічнага сада. Гаспадары сядзіб арганізуюць для адпачываючых рыбалку на рэках Свіслач і Бярэзіна, паездкі за грыбамі і ягадамі, пешыя прагулкі на свежым паветры, катанне на лодцы, прыгатаванне страў з экалагічна чыстых с/г прадуктаў, прадастаўлення ўчастка і ўмоў для адпачынку (мангал, дровы, шампуры), урокі кветкаводства (пасадка, прышчэпка, чаранкаванне кветак і т.п.) і рукадзелля, адпачынак у рускай лазні. Арганізуюцца цікавыя экскурсіі. Сардэчныя гаспадары створаць усе ўмовы для плённага адпачынку, які запамінаецца.

*«На Пцічы».* Двор знаходзіцца на беразе ракі Пціч. На яе тэрыторыі размешчана 2 дамы. На прысядзібным участку маюцца фруктовы сад, пчальнік, вырошчваецца разнастайная сельскагаспадарчая прадукцыя: бульба, памідоры, агуркі, цыбуля, часнок. Для турыстаў арганізоўваюцца экскурсіі па гістарычных месцах Асіповіцкага раёна, у Дараганаўскі музей. Таксама да паслуг адпачываючых: лазня, рыбалка, збор грыбоў і ягад у лесе, прапануюцца настольныя гульні – шашкі, шахматы і нарды.

*Сялянская фермерская гаспадарка «Радзімічы–аграсервіс».* У 20 км ад горада Асіповічы размясцілася маленькая вёсачка Пабаковічы. Гордасцю населенага пункта з’яўляецца незвычайнае па сваёй прыгажосці возера. Прыехаўшы, вы зможаце акунуцца ў чыстую празрыстую ваду, палюбавацца прыгажосцю краявідаў, парыбачыць. На беразе абсталяваны спецыяльныя альтанкі для адпачываючых. Свежае паветра, вячэрнія прагулкі, пачуццё яднання з прыродай нададуць вам сілы і прынясуць душэўную раўнавагу.

***Асвяжы цела і душу ва ўнікальных аграсядзібах***

# Гурманская асалода і забавы

*Смачнае і сытна.* Асіпаўчане, як і ўсе беларусы, любяць смачна і сытна паесці. Самыя папулярныя традыцыйныя асіповіцкія ласункі – гэта чорны хлеб, розныя хлебабулачныя і кандытарскія вырабы Асіповіцкага хлебазавода, глазураваныя сыркі, тварог, смятана мясцовага малочнага камбіната, шакаладныя цукеркі «Белга». У цёплы час года ўсім жадаючым будзе прапанаваны пакаштаваць асіповіцкага квасу.

*Кухня ўсяго свету.* У нас шмат устаноў не толькі з нацыянальнай кухняй, дзе можна прадэгуставаць беларускія дранікі, бацвінне, халаднік, калдуны, але і з кухняй самых розных краін свету. Тут вы можаце пакаштаваць палюбіўшыяся вам італьянскія, французскія, рускія, японскія, кітайскія стравы і стравы іншых краін – вельмі добра праведзяце час за гурманскай трапезай.

*Забавы вышэйшага класу.* У Асіповічах вы знойдзеце мноства сучасных гарадскіх забаў: утульныя гандлёвыя цэнтры «Еўраопт», «Суседзі», «Дабраном» і эксклюзіўныя магазінчыкі, салоны прыгажосці. Цешцеся забавамі вышэйшага класа!

***Адчуй сябе сапраўдным гурманам смаку і забаў!***

# Ашаламляльныя культурныя мерапрыемствы

*Культура Асіповіцкага раёна* – гэта шматгранны свет багатага фальклору, народных рамёстваў, шматжанравага прафесійнага мастацтва, індывідуальнай і калектыўнай мастацкай творчасці, эстэтычнага пошуку і дасягненняў. Менавіта тут быў праведзены першы ў рэспубліцы міжнародны фестываль аўтэнтычнага фальклору Беларускага Прыдняпроўя. Асіповіцкі раён стаў месцам правядзення канцэртаў рэспубліканскага фестывалю «Майстры мастацтва – працаўнікам сяла», Міжнароднага фестывалю «Вянок дружбы», абласнога фестывалю духавой музыкі «Па галоўнай вуліцы з аркестрам» і традыцыйнага свята «Дажынкі». Два калектывы мастацкай самадзейнасці ўдзельнічалі ў мерапрыемствах Дзён культуры Беларусі ў г. Маскве ў складзе Магілёўскай вобласці. Народны духавы аркестр, народны хор ветэранаў вайны і працы, народны ансамбль «Чыстыя крыніцы», народны ансамбль песні, музыкі і танца «Сузор'е», народны ансамбль беларускай песні «Сваякі» прымалі ўдзел у міжнародных фестывалях «Славянская культура», «Врачанская весна», рэспубліканскіх фестывалях «Не старэюць душой ветэраны», «Звіняць цымбалы і гармонік», «Траецкі кірмаш», «Аўцюкі», абласных фестывалях «Беларусь – мая песня», «Сузор'е талентаў», фестывалі Беларускага Прыдняпроўя, абласнога свята «Народная прыпеўка». Хор старэйшых класаў Асіповіцкай дзіцячай школы мастацтваў № 1 зъяўляецца лаўрэатам рэспубліканскага фестывалю акадэмічных харавых калектываў імя Р. Шырмы, лаўрэатам Міжнароднага фестывалю духоўнай музыкі «Магутны Божа». У рамках развіцця міжнароднага супрацоўніцтва ўзорны ансамбль «Крынічка» Асіповіцкай дзіцячай школы мастацтваў № 1 прыняў удзел у міжнародным дзіцячым фальклорным фестывалі ў Турцыі, народны ансамбль «Сузорье» Пратасевіцкага сельскага Дома культуры ўдзельнічаў у канцэртных праграмах Дзён беларускай культуры у Францыі. Народны ансамбль песні і музыкі «Дзівакі» прымаў удзел у тэлеперадачы «Спявай, душа».

*Свята народнай творчасці.* У апошні дзень вясны 1992 года пачаў свай шлях раённы фестываль самадзейнай творчасці «Веснавыя колеры». Штогадовае раённае свята песні, музыкі і танца паступова дасягнула міжнароднага ўзроўню. У Асіповічы прыязджаюць госці з Малдовы, Балгарыі, Якуціі, Масквы, Растова, Валгаграда, Арэнбурга, Краснадара. Далучайцеся і вы!

*Культура – жывая!* У 2013 годзе статус культурнай сталіцы Беларусі і СНД атрымаў Магілёў. У сувязі з гэтым праводзіліся творчыя праекты: канцэрты, святы мастацтваў, выставы, конкурсы. Магілёў наведвалі прафесійныя танцавальныя, музычныя, харэаграфічныя калектывы.

***Не прапусціце выпадку пабачыць сваімі вачыма прадстаўленні самабытных майстроў сцэны.***

# Святая крыніца «Прошча»

*Храм душы.* У Беларусі ёсць месцы, якія прываблiваюць сотні хрысціянскіх паломнікаў. Адно з іх знаходзіцца ў прыгожым кутку Асіповіччыны ў мястэчку Прошча. У старадаўнія часы тут знаходзілася язычніцкае свяцілішча, якое ў перыяд хрысціянізацыі ператварылася ў праваслаўную Святыню. У 3 км на поўнач ад вёскі Коханаўка, у лесе знаходзіцца царква ў гонар іконы Маці Божай «Жыватворная крыніца». Пабудавана яна ў 1992 годзе. Гісторыя будаўніцтва царквы непасрэдна звязана з крыніцай «Прошча». Вы пачуеце легенды пра будаўніцтва царквы, пра цуды вылячэння, якія адбыліся ў гэтай мясцовасці. Існуе такая легенда. «Калісьці з вялікага свята ішлі два старцы-сляпыя з вёскі Карытнае. І як патрапілі ў гэты лес, яны самі не ведаюць. Куды ні кінуцца – вакол дрэвы. Паваліліся яны на калені і сталі маліцца Богу. Тут каля іх зажурчэла вада, і яны нахінуліся напіцца, прамылі вочы і во цуда.., сталі відушчымі! Бачаць на бярозе ікона Божай Маці. Яны не ведалі, як ім выйсці, і праблукалі ўсю ноч. З горам папалам яны ўсё-такі выйшлі да вёскі Карытнае, зайшлі да святара і пра ўсё расказалі. Святар зазваніў у званы – сабраліся людзі. І пайшлі на то месца, дзе была ікона. Памаліліся Богу і ўзялі ікону ў Карытнянскую царкву. Потым замкнулі яе і разышліся па дамах. А калі на наступны дзень прыйшлі на службу, аказалася, што іконы няма. І яны пайшлі на тое месца, адкуль яе ўзялі. Прычым заявілі цару, што здарылася такое цуда. Ён загадаў забраць ікону ў Карытнае, заперці на два замкі ў царкве. Адзін ключ аддаць яму, а другі – святару. Зноў людзі прыходзяць на службу – няма іконы. Загадаў тады цар пабудаваць царкву на тым месцы, дзе знайшлі ікону старыя. І было там шмат вылечаных людзей. Ёсць яны і зараз, але не так як раней». І зараз людзі ідуць і едуць у Прошчу, памаліцца, папіць са святой жыватворнай крыніцы.

***Умацуй свае надзеі, здароўе, адчуй любоў да ўсяго чалавецтва.***



# Казачны замак, акружаны рэкамі

*Крыху гісторыі.* Найбуйнейшы археалагічны помнік Асіповіцкага раёна – замчышча ў вёсцы Свіслач. У XII–XIV стагоддзях мястэчка Свіслач было цэнтрам удзельнага княства. На паўднёвай ускраіне вёскі, на ўзнёслым водападзеле рэк Свіслачы і Бярэзіны знаходзіцца тэрыторыя, якую ўсе мясцовыя жыхары называюць звычайна «замак». Як гаворыць энцыклапедыя Бракгаўза і Эфрона, пабудаваны ён быў у 1510 годзе. Гара, на якой ён стаяў, рабіла яго даволі ўмацаваным, але над умацаваннем добра папрацавалі і людзі. З трох бакоў замка быў зроблены роў, а з боку ракі Свіслач рова не было зусім. Трапіць у замак можна было праз мост, перакінуты праз роў. Усё насельніцтва воласці было прывязана да замка. Яно павінна было ствараць, рамантаваць і сцерагчы замак. Пад кіраўніцтвам Багуслава Радзівіла ў сярэдзіне 17 стагоддзя была праведзена рэканструкцыя замка, які ператварыўся з выключна ваеннага аб’екта ў феадальны двор, болей утульны, але слаба прыстасаваны для абароны. У 1655 годзе Свіслач была ўзята штурмам, а замак разбураны і спалены. Гэтым журботным фактам заканчваецца гісторыя Свіслацкага замка. Як фартыфікацыйнае ўмацаванне ён ужо не аднаўляўся. Зараз ад замка засталіся толькі рэшткі земляных валоў і рова.

*Легенда аб замкавай гары ў вёсцы Свіслач.* На гары ў в. Свіслач у далёкія часы знаходзіўся вялікі замак. У адным з паданняў гаворыцца, што матэрыялы для будаўніцтва замка прывозілі з Украіны. У замку жыла жанчына-прывід. Яна часта з'яўлялася на замкавай гары ў белым адзенні. Хто яе пабачыць, радаваўся, верыў, што бяда абыдзе бокам яго дом. У 1919 г. падчас пажару многія бачылі гэты прывід, акружаны вянком. Ён падняўся ўверх і знік. Больш яго ніхто не бачыў. Але аднойчы ноччу адной жыхарцы вёскі прысніўся сон. У сне жанчына-прывід, растлумачыла прычыну свайго знікнення: пакрыўдзілі яе жыхары тым, што перасталі прыслухоўвацца да голасу свайго сумлення, сталі жорсткімі сэрцы людзей. І калі людзі зноў палюбяць адзін аднога бескарыслівай, дзіцячай, даверлівай любоўю, тады вернецца Анёл-захавальнік замкавай гары в. Свіслач.

***Пахадзіце па гэтай зямлі, пакланіцеся продкам, палюбуйцеся гладдзю рэк!***

# Асіповіцкая кругасветка

*Кругасветнае падарожжа за 5 дзён.* Запрашаем Вас у падарожжа па Асіповіцкім раёне, у край, які гоманам шматлюдных дарог і цішынёй сцежак, усмешкамі ветлівых гаспадароў і п’янлівай прыгажосцю рэк Свіслач і Пціч натхніў не адно пакаленне служыцеляў муз апець будні і святы, росквіт і шчаслівую будучыню зялёнай жамчужыны Беларусі. Усім, хто шчырай душой і добрым сэрцам імкнецца пазнаць Асіповіцкі край і далучыцца да яго таінстваў, скарбонка прыроды адкрыецца ўсёй прыгажосцю і багаццем. Усе набытыя ўражанні дапамогуць глыбей зразумець характар гэтых месцаў і людзей, якія тут жывуць. Рэкі і сцежкі, палі і лясы, абноўленыя вёскі раскажуць вам у сто разоў больш, чым усе экскурсаводы разам узятыя. Прыязджайце і адкрыйце для сябе гэту прыгожую і дзіўную зямлю.

*«Шляхам Рагнеды».* Доўга плыла апальная вялікая кіеўская княгіня Рагнеда са сваім малалетнім сынам Ізяславам на чаўнах спачатку па р. Днепр, потым па р. Бярэзіна, а далей па р.Свіслач да самых Полацкіх земель. Аматараў водных прагулак запрашаем праплысці маршрут па рэках Свіслач і Бярэзіна працягласцю ў 70 км за тры дні.

***Праедзьце на веласіпедзе, праплывіце па рэках, паглядзіце на Асіповіцкі раён. Гарантуем, не пашкадуеце!***